ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ПОЛАЦКАЯ ЗЯМЛЯ І ЛІТВА Ў КАНЦЫ XII – ПАЧАТКУ XIII СТАГОДДЗЯЎ: ПОГЛЯД НА АСПЕКТЫ ВАЕННЫХ УЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ

**СЯРГЕЙ ЕМЯЛЬЯНАЎ**

***Анатацыя:*** Артыкул прысвечаны праблематыцы полацка-літоўскіх ваенных узаемадачыненняў у канцы XII – пачатку XIII стагоддзяў. Літоўскія плямёны расцэньваюцца як небяспечны сусед, але і карысны саюзнік для Полацкай зямлі. Акрамя правядзення сумесных паходаў і папаўнення літоўскімі дружынамі полацкіх войскаў, пастаянны прыток літоўскіх наёмнікаў спрыяў кансервацыі рысаў грамадскага ладу часоў эпохі вікінгаў і можа патлумачыць доўгае захаванне дэмакратычнай традыцыі ў Полацкай зямлі.

***Ключавыя словы:*** Полацкая зямля, літоўскія плямёны, ваенныя ўзаемадачыненні, мілітарная гісторыя.

## POLACK LAND AND LITHUANIA AT THE END OF THE 12TH – BEGINNING OF THE 13TH CENTURIES: A LOOK AT THE ASPECT OF MILITARY RELATIONS

***Abstract:*** The article is devoted to the Polack-Lithuanian military relations at the end of the 12th – beginning of the 13th centuries. The Lithuanian tribes are regarded as dangerous neighbors, but also as a useful ally of the Polack Land. Joint military campaigns, recruitment of Lithuanian squad to the Polack troops and a constant flow of Lithuanian mercenaries created conditions for conservation of the Viking age social system. Also, it explains the preservation of democratic tradition in Polack for a long time.

***Keywords:*** Polack Land, Lithuanian Tribes, Military Relations, Military History.

Праблемы полацка-літоўскіх узаемадачыненняў у перыяд XII–XIII стагоддзяў з'яўляюцца надзвычай дыскусійнымі. У гістарыяграфіі прысутнічае традыцыя разглядаць час, калі ўзрастае ваенная актыўнасць Літвы, праз прызму літоўскіх набегаў на Русь. У той жа час звесткі аб войнах "літвы" з Полацкай зямлёй саступаюць па колькасці ўзгадак, у параўнанні з астатнімі рускімі землямі. Такім чынам, у навуцы склалася дзве асноўныя гіпатэтычныя тэзы аб літоўскай экспансіі ў Падзвінні:

- паколькі літва нападала на Смаленшчыну, Пскоўшчыну і Наўгародчыну, то набегі ніяк не маглі абмінуць Полаччыну;
- адсутнасць звестак аб баявых дзеяннях на Полаччыне кажа аб катастрафічным стане яе абарончых магчымасцяў у выніку ранейшых войнаў з Літвой.

У той жа час агульная карціна, якая вынікае з розных крыніцаў, дазваляе прапанаваць іншае тлумачэнне. Пашырэнне на захад улады Полацкіх князёў у XI стагоддзі ўключыла некаторыя балцкія плямёны ў арэал полацкага ўплыву. Літва XII – пачатку XIII стагоддзяў знаходзілася на стадыі фармавання патэстарнай сістэмы, якая суправаджаецца падвышанай мілітарнай актыўнасцю. Гэта рабіла літоўскія плямёны небяспечным, але і карысным суседам для Полацкай зямлі.

У XII – пачатку XIII стагоддзяў і ў рускіх, і ў заходніх крыніцах маюцца ўзгадкі аб уваходжанні літоўскіх дружынаў у склад войскаў полацкіх князёў або аб сумесных дзеяннях літвы і палачанаў.

Па-першае, "літва" ўліваецца ў міжсобныя баявыя дзеянні полацкіх князёў. Так, у 1162 годзе, падчас аблогі Гарадца, у пераможную начную вылазку супраць палачанаў разам з Валадаром Глебавічам выходзяць менавіта літоўцы (Ипатьевская летопись, 2001: 355). "Літва" ўдзельнічае і ў вялікім паходзе на Друцк, здзейсненым у 1180 годзе (Ипатьевская летопись, 2001: 419), які, відаць, паклаў канец саюзніцкай залежнасці Полацкай зямлі ад Смаленскай, што ўтварылася на мяжы 1160–1170-х.

Па-другое, мае месца выкарыстанне літоўскіх дружынаў у вонкавапалітычных інтарэсах полацкіх князёў. Цікавымі выглядаюць абставіны баявых дзеянняў пад Вялікімі Лукамі ў 1198 годзе. У паведамленні аб смерці Ізяслава Яраславіча сказана, што той *"бяше посаженъ на Лукахъ княжити и бѣ отъ Литвы оплечье Новугороду"* (Новгородская первая летопись, 2001: 237). Гэта ўказвае на наяўнасць досыць пастаяннай літоўскай пагрозы Наўгародскай зямлі. Аднак у гэтым жа годзе *"придоша полочане съ Литвою на Лукы и пожьгоша хоромы, а лучане устрегошася и избыша в городѣ"*(Новгородская первая летопись, 2001: 238). Такім чынам, праваднікамі паходу небяспечнай для наўгародчыны "літвы" выступаюць палачане.

Апісанні сумесных баявых дзеянняў “літвы” і палачанаў сустракаюцца і ў Генрыха Латвійскага (Henricus de Lettis, Heinrich von Lettland). Так, саюзнікам літоўцаў выступае Усевалад з Герцыке, які быў жанаты з дачкой аднаго з літоўскіх князёў. Паводле Генрыха, ён *“eis omni familiaritate coniunctus, dux exercitus eorum frequenter existebat et transitum Dune eis et victualia ministrabat, tam euntibus in Ruciam, quam Lyvoniam et Estoniam” (“...з імі ўсімі сяброўствам злучаны, ачольваў войскі іхнія часта, і перапраўляў праз Дзвіну іх, і харчаваннем забяспечваў, калі ішлі яны на Русь, Лівонію ці Эстонію”)*[1] (Генрих Латвийский, 1938: 313). Нават пасля паразы, панесенай ад лівонскіх рыцараў, і фармальнага атрымання сваіх уладанняў у лен ад рыжскага біскупа, гэты князь працягваў дапамагаць літоўцам *“consilium et auxilium” (“і радай і чынам збройным”)* (Генрих Латвийский, 1938: 353). Варта адзначыць, што ў шэрагу абвінавачванняў, звернутых з боку лівонскіх рыцараў у бок Усевалада, сустракаецца і сумесная з літоўцамі агрэсія супраць *“Ruthenorum tuorum christianorum” (“тваіх рускіх хрысціянаў”)* (Генрих Латвийский, 1938: 315). Генрых Латвійскі ацэньвае Русь-“Русію” (*Ruscia*) як адзіную прастору, надаючы мала ўвагі рэальным палітычным канфліктам унутры гэтага рэгіёну. З карціны, што вымалёўваецца па рускіх крыніцах, магчыма меркаваць, што аб’ектам сумесных нападаў літоўцаў і Усевалада былі, зразумела, не полацкія ўладанні, а іншыя, хутчэй за ўсё, – наўгародскія і пскоўскія, землі, адносіны з якімі ў Полацка былі традыцыйна канфліктнымі.

Аб тым, што дзеянні ўладара Герцыке не былі яго прыватнай практыкай сведчыць эпізод з няўдалым паходам на Рыгу, арганізацыяй якога займаўся полацкі “кароль” Вальдэмар (Валадар або Уладзімір).[2] Паводле Генрыха, Вальдэмар *“mittensque in Rustiam et Letoniam, convocavit exercitum magnum Ruthenorum atque Letonum” (“паслаў у Русію і Літву, склікаў войска вялікае з русінаў і літоўцаў”)* (Генрих Латвийский, 1938: 369).

Усё гэта дазваляе меркаваць аб магчымасці скіравання Полацкам літоўскіх дружынаў на сваіх палітычных ці эканамічных праціўнікаў. Аб тым, што літоўцы бралі ўдзел у аперацыях рускіх князёў, напрыклад, дамова 1215 года з Галіцка-Валынскай зямлёй, дзе, з аднаго боку, літвой быў абяцаны мір галіцкім князям, а з іншага – абгаворваўся абавязак вайны з “ляхамі” (Ипатьевская летопись, 2001: 491–492). Так, у 1235 годзе літоўцы, у тым ліку дружына Міндоўга, удзельнічаюць у

[1] Тут і далей – пераклад аўтара.

[2] Генрых Латвійскі называе яго *“Woldemaro de Ploceke”* (Вальдэмар Полацкі), што традыцыйна інтэрпрэтуецца як “Уладзімір”. Аднак пачынаючы ад Міколы Ермаловіча (2001: 242–243), у беларускай гістарыяграфіі прысутнічае іншае прачытанне – “Валадар”. Гэтае імя было папулярнае сярод полацкіх князёў, у адрозненне ад імя “Уладзімір”, звязанага з Уладзімірам Святым, забойцам Рагвалода.

паходзе на Конрада Мазавецкага разам з войскам наваградскага князя Ізяслава, а сам паход ініцыюецца па загадзе галіцкага ўладара Данілы Раманавіча (Ипатьевская летопись, 2001: 517).

Выкарыстанне літоўскай збройнай сілы ў сваіх інтарэсах, у тым ліку магчымасць наймання літоўскіх дружынаў полацкімі князямі, можа быць разгледжана ў больш шырокім сацыяльна-палітычным кантэксце. З завяршэннем у XI стагоддзі "эпохі вікінгаў" і, адпаведна, спыненнем плыні скандынаўскіх наймітаў князі Паўднёвай Русі паступова пераходзяць да напаўнення земляў сталым мясцовым дружынным элементам (Ипатьевская летопись, 2001: 83), які ўтрымліваўся за кошт грамадаў і змяняў раскладку сілаў між вольнымі людзьмі і князем на карысць апошняга. Паўночная Русь, дзе заставалася магчымасць выкарыстоўваць часовыя найманыя дружыны, закансервавала, такім чынам, сацыяльную сістэму ранейшага перыяду, дзе пастаяннае княжацкае войска мела невялікі памер, а агульная мілітарная моц зямлі залежала ад вольнага насельніцтва, якое выстаўляла апалчэнне і вызначала аб'ёмы ўтрымання для наймітаў, рэгулюючы такім чынам іх колькасць. Усё гэта можа дадаткова вытлумачыць сталае існаванне дэмакратычнай традыцыі ў паўночнарускіх землях, у прыватнасці – у Полацкай.

***Бібліяграфія***

1. Генрих Латвийский (1938). *Хроника Ливонии.* Москва – Ленинград: Издательство Академии Наук СССР.

2. Ермаловіч, Мікола (2001). *Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды.* Мінск: Мастацкая літаратура.

3. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. Русские летописи. Т. 10. (2001). Рязань: Александрия, Узоречье.

4. Ипатьевская летопись. Русские летописи. Т. 11. (2001). Рязань: Александрия.